## Ліквідацыя непісьменнасці дарослых у Савецкай Беларусі

У ліку важнейшых задач культурнага будаўніцтва ў Беларусі была ліквідацыя непісьменнасці і малапісьменнасці насельніцтва. Яна з'яўлялася адначасова і палітычнай задачай, бо непісьменны чалавек стаіць па-за палітыкай. Пачатак ажыццяўлення гэтай задачы быў пакладзены дэкрэтам СНК РСФСР "Аб ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослага насельніцтва РСФСР" ад 26 снежня 1919 г., паводле якога асобы ва ўзросце ад 8 да 50 гадоў, што не ўмелі чытаць і пісаць, абавязваліся вучыцца грамаце на роднай або рускай мове. Адпаведны загад быў выдадзены 11 снежня 1920 г. Ваенна-рэвалюцыйным камітэтам ССРБ за подпісам А. Чарвякова. У ім гаварылася: "Усе грамадзяне ССР Беларусь ад 8 да 50 гадоў, якія не ўмеюць чытаць і пісаць, павінны не далей як за адзін год, лічачы з 15 студзеня 1921 г. навучыцца грамаце на роднай ці рускай мове" [1, л.50]. Адносна асоб, якія ўхіляліся ад навучання, згодна з загадам, павінны былі вызначацца розныя меры пакарання: перавод з вышэйшай харчовай катэгорыі ў ніжэйшую, пазбаўленне пайка, выключэнне з ліку членаў прафесіянальнага саюза ды інш. Са зместу гэтага загада можна зрабіць выснову, што праблема ліквідацыі непісьменнасці надзвычай турбавала кіраўніцтва рэспублікі. У 1920 г. на 1 000 чалавек насельніцтва Беларусі пісьменных было 315 чалавек [2, арк.432], а ва ўзросце ад 9 да 49 гадоў непісьменныя складалі 52,6% [3, с. 158]. Параўнаем: у Бельгіі на 1 000 чалавек насельніцтва непісьменных мелася 2 чалавекі, у Германіі - 20, Швецыі - 21, Вялікабрытаніі - 30, Францыі - 150, а ў былой царскай Расіі - 788 чалавек [4, с.97].

Зразумела, што адных загадаў і пастаноў было недастаткова. Ліквідацыя непісьменнасці на Беларусі з'яўлялася задачай першараднай важнасці і даволі складанай па тэхнічным выкананні. Справа ў тым, што насельніцтва Беларусі неаднароднае па свайму складу. Большасць тут

складалі беларусы, а пражывалі і палякі, і яўрэі, і рускія. Права ўсіх нацыянальнасцей патрабуе да сябе павагі, і Савецкая ўлада прымусова не навязвала вывучэнне рускай мовы. На Беларусі дзейнічалі беларускія, рускія, польскія і яўрэйскія школы па ліквідацыі непісьменнасці.

Ва ўсёй рабоце па ліквідацыі непісьменнасці на Беларусі вылучаюцца тры галоўныя моманты: стварэнне апарату па ліквідацыі непісьменнасці, праца ў школах для дарослых, агітацыйная дзейнасць [2, арк.432].

У ліпені 1920 г. СНК РСФСР утварыў Усерасійскую надзвычайную камісію па ліквідацыі непісьменнасці. Аналагічная камісія была створана пры Палітасвеце Наркамасветы ССРБ у лістападзе 1920 г. Згодна з палажэннем аб губернскіх надзвычайных камісіях па ліквідацыі непісьменнасці, яны з'яўляліся часовымі самастойнымі органамі, у задачы якіх уваходзіла аб'яднанне і накіраванне ўсёй работы па ліквідацыі непісьменнасці ведамасных, прафсаюзных і ваенных органаў пад кіраўніцтвам Усерасійскай Надзвычайнай камісіі, распрацоўка і здзяйсненне агульнадзяржаўных планаў і праграм па ліквідацыі непісьменнасці для дадзенай губерні [1, арк.111].

Нягледзячы на вялікія матэрыяльныя цяжкасці ў краіне, ужо ў 1921 г., першым годзе мірнага сацыялістычнага будаўніцтва, рэспубліканская і павятовыя надзвычайныя камісіі па ліквідацыі непісьменнасці разгарнулі шырокую работу. Праводзіўся ўлік непісьменных, арганізоўваліся новыя лікпункты, школы пісьменнасці, хаты-чытальні. Вялікая праца ажыццяўлялася па забеспячэнні лікпунктаў і школ граматы памяшканнямі, палівам, асвятленнем, букварамі, сшыткамі. Улік непісьменных і малапісьменных у г. Мінску праводзіўся Статыстычным аддзелам Наркамасветы, у паветах - павятовымі і валаснымі надзвычайнымі камісіямі пры пасрэдніцтве валасных упаўнаважаных з прыцягненнем сельскіх Саветаў і мясцовых работнікаў культустаноў. Колькасць

непісьменных у ССРБ, улічаных за 1921 г., складала 503 тыс. чалавек, што, адносна тагачаснай колькасці 1,3 млн. насельніцтва Беларусі, налічвала каля 39% жыхароў рэспублікі [5, арк.10].

Зразумела, каб правесці на тэрыторыі Беларусі ўсеагульную ліквідацыю непісьменнасці, неабходна было прыцягнуць для гэтага ўсе культурныя сілы, а таксама вялікія матэрыяльныя сродкі. У першую чаргу ўсе настаўнікі абавязваліся праводзіць заняткі з дарослымі ў вячэрніх школах граматы. Работнікі асветы, ураджэнцы Беларусі, былі камандзіраваны з Расіі (паводле пастановы СНК ад 9 мая 1921г.) у распараджэнне Наркамасветы Беларусі [6, арк.65]. Паралельна з улікам быў арганізаваны збор падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў і прадметаў абсталявання для школ граматы. Дзяржвыдавецтвам Беларусі да лютага 1921 г. было надрукавана 50 тыс. экземпляраў буквароў і тысяча экземпляраў разразных азбук. Для выдання беларускіх падручнікаў летам 1921 г. за мяжу выехала спецыяльная камісія. Кнігі друкаваліся ў Коўна і Берліне, а затым і ў Мінску. Да пачатку навучальных заняткаў выйшла ў свет “Практычная граматыка беларускае мовы” Я. Лёсіка [7, с.44].

3 верасня 1920 па жнівень 1921 г. быў адкрыты 41 лікпункт [8, арк.38]. Школы граматы для дарослых пачалі дзейнічаць пры саюзах, савецкіх установах, міліцыі, клубах, фабрыках, заводах і г.д. Фактычна яны адкрываліся са студзеня 1921 г. і ўжо за два месяцы іх мелася больш за 90 у г. Мінску з агульнай колькасцю 7 тыс. чалавек. Працавала 210 школьных работнікаў, 5 інструктараў і 2 інспектары-рэвізоры [9, с. 119-120]. На канец 1921 г. на Беларусі налічвалася 1 088 школ па ліквідацыі непісьменнасці [10, с.52].

Скіраванасць дзяржавы на новую эканамічную палітыку прымусіла скараціцца апарат Надзвычайнай камісіі па ліквідацыі непісьменнасці, зліцца з пададдзелам школ для дарослых пры Галоўпалітасвеце, а ў студзені 1922 г.- пераўтварыцца ў аддзел школ для дарослых па ліквідацыі

непісьменнасці. Далейшае скарачэнне ў лютым, а затым у маі давяло аддзел да аднаго інструктара па ліквідацыі непісьменнасці, а школы, якія ім абслугоўваліся, як па ліквідацыі непісьменнасці, так і школы для дарослых былі скарочаны да мінімума. Дарэчы, школы паступова спынялі сваю дзейнасць з-за недахопу сродкаў, але ўсё-такі на 1 студзеня 1922 г. яшчэ заставалася 407 камплектаў па ліквідацыі непісьменнасці і 61 школа для дарослых [1, арк.161].

Камісія па перагляду і скарачэнні штатаў пры ЦВК Беларусі, сцвярджаючы прынцып скарачэння школ па абслугоўванні рабочых, членаў прафсаюзаў і чырвонаармейцаў, зняла ўсе сельскія лікпункты з дзяржаўнага забеспячэння, пакінуўшы па Беларусі толькі 18 школ па ліквідацыі непісьменнасці з 65 камплектамі і 24 школы для дарослых з 93 "шкрабамі" (школьнымі работнікамі) [1, арк.161]. Меркаваляся, што знятыя з дзяржаўнага забеспячэння школы будуць захаваны шляхам утрымання іх прафсаюзнымі і кааператыўнымі арганізацыямі, але на самай справе зусім нязначная частка школ дзейнічала на ўмовах самааплаты, а астатнія закрыліся.

Цікава праходзіла скарачэнне школ па ліквідацыі непісьменных і школ для дарослых у 1922 г. Напрыклад, школ па ліквідацыі непісьменнасці ў студзені было 327 (з 11 298 навучэнцамі і 427 "шкрабамі"), а ў кастрычніку - толькі 58 (з 1 134 навучэнцамі і 58 "шкрабамі"); школ дарослых у студзені - 61 (з 2 637 навучэнцамі і 170 "шкрабамі"), у кастрычніку - 19 (з 2 393 навучэнцамі і 89 "шкрабамі") [11, арк.6]. У гэтым жа годзе пры скарачэнні сродкаў на ліквідацыю непісьменнасці абавязковасць навучання тычылася асоб маладога ўзросту, прычым да навучання павінны былі прыцягвацца чырвонаармейцы, міліцыянеры, члены прафсаюзаў, камсамольцы, у вёсцы - работнікі калгасаў і саўгасаў. Адной з самых неадкладных задач таго часу з'яўлялася ліквідацыя непісьменнасці сярод падлеткаў ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў.

Што тычыцца старэйшых узростаў, то яны прыцягваліся ў добраахвотным парадку.

Наркамасветы і Надзвычайнай камісіяй па ліквідацыі непісьменнасці былі распрацаваны навучальныя планы і разасланы ва ўсе паветы. Іх атрымалі пункты ліквідацыі непісьменнасці (на ўтрыманні Наркамасветы іх значылася 32), школы для малапісьменных (на ўтрыманні іх таксама было 32), агульнаадукацыйныя школы (гарадскія) для дарослых і агульнаадукацыйныя школы (сельскія) для дарослых (на ўтрыманні Наркамасветы іх было 14), вячэрнія школы II ступені для дарослых членаў КСМ і беспартыйнай моладзі (на ўтрыманні - 6 школ) [11, арк.7-8]. Школы ўсіх тыпаў камплектаваліся, галоўным чынам, членамі прафсаюзаў.

Работа па ліквідадыі непісьменнасці працоўных у Беларусі праводзілася дзяржаўнамі органамі і грамадскімі арганізацыямі. На арганізацыйным пасяджэнні прадстаўнікоў дзяржаўных устаноў, партыйных і прафсаюзных арганізацый пры Галоўпалітасвеце 16 снежня 1923 г. было вырашана пытанне аб арганізацыі пры Галоўпалітасвеце камісіі па ліквідацыі непісьменнасці. У склад яе ўвайшлі прадстаўнікі Мінскага гарадскога аддзела народнай асветы, ЦК КСМБ, жанаддзела ЦК КП(б)Б, культаддзела, Савпрафбела і лва прадстаўнікі ад Галоўпалітасветы [11, арк.117].

Плённа працавалі такія дзяржаўныя дзеячы і дзеячы адукацыі як А. Чярвякоў, А. Баліцкі, У. Ігнатоўскі, З. Жылуновіч, З. Сцяпура, Я. Наумёнак, Х. Сцепанюк, І.Валасевіч, С. Шыёнак, І.Мазур і інш. Пяру Чарвякова, Баліцкага, Сцяпуры належыць нямала артыкулаў, якія не страцілі сваёй каштоўнасці і сёння. У іх аналізавалася і высвятлялася культурна-масавая работа ў вёсках, плённая праца настаўнікаў, шырока паказвалася роля жанчыны ў сацыялістычным будаўніцтве, дзейнасць Саветаў і дзяржаўнага апарата, асобных структурных арганізацый.

У наладжванні работы па ліквідацыі непісьменнасці дарослага

насельніцтва рэспублікі прымалі ўдзел прафесійныя саюзы Беларусі, якія праводзілі гэтую работу за кошт адлічэнняў культфондаў. У выніку работы з’ездаў прафесійных саюзаў рэспублікі, якія нароўні з гаспадарчымі пытаннямі абмяркоўвалі пытанне аб культурна-асветніцкай дзейнасці, у тым ліку аб ліквідацыі непісьменнасці членаў прафсаюзаў, былі адкрыты школы граматы на прадпрыемствах гарбарнай, хімічнай, швейнай прамысловасці, саюза работнікаў народнага харчавання і іншых [13, с. 17-20].

У маі 1923 г. у Маскве адбыўся II Усерасійскі з’езд па ліквідацыі непісьменнасці. Пасля з’езда ўпершыню быў складзены план, згодна з якім неабходна было ліквідаваць непісьменнасць сярод насельніцтва БССР ва ўзросце ад 18 да 35 гадоў да 10-гадовага юбілею Кастрычніцкай рэвалюцыі. Ставілася задача ліквідаваць непісьменнасць сярод членаў партыі, камсамола, прафсаюзаў, дэлегатак жаночых аддзелаў, членаў Саветаў да 1 мая 1925 г.

Пасля II Усерасійскага з’езда па ліквідацыі непісьменнасці была складзена сетка ўстаноў Галоўпалітасветы на 1923-1924 г. У гэту сетку ўвайшлі наступныя ўстановы: пункты па ліквідацыі непісьменнасці (па адным на кожную воласць); трохгадовыя вячэрнія школы для дарослых з падрыхтоўчым аддзяленнем для непісьменных і малапісьменных на 160 чалавек; чатырохгадовыя вячэрнія школы для рабочых падлеткаў і КСМ ( у Мінску іх было тры і па адной - на павет, разлічаныя на 160 чалавек); вячэрнія партшколы з трымя аддзяленнямі: 1) па ліквідацыі непісьменнасці для членаў і кандыдатаў партыі на 30 чалавек; 2) павышанага тыпу на 30 чалавек; 3) паніжанага тыпу на 60 чалавек. Працягласць навучання кожнага аддзялення складала 6 месяцаў. У Мінску меліся тры школы (па адной на кожны райкам) і па адной школе на кожны павет рэспублікі.

У саўгасах ліквідацыя непісьменнасці праводзілася ў спецыяльных школах, якія ўтрымліваліся за кошт культфонду саюза работнікаў зямлі і

лесу Наркамзему БССР. Аіквідацыя непісьменнасці сярод дапрызыўнікаў 1902-1903 гг. нараджэння павінна была завяршыцца да 23 лютага 1924 г. [11, арк.121]. Праводзіліся спецыяльныя зборы дапрызыўнікаў тэрмінам на чатыры тыдні для ліквідацыі непісьменнасці ў парадку дапрызыўнай падрыхтоўкі. У кожнай воласці ў 1923-1924 гг. для ліквідацыі непісьменнасці стваралася па адной школе, цесна звязанай з хатай-чытальняй. Валасныя школы ўтрымліваліся за кошт Галоўпалітасветы. Згодна з пастановай Галоўпалітасветы, з 1 кастрычніка 1923 г. валасныя выканаўчыя камітэты выклікалі ўсіх непісьменных дапрызыўнікаў, забіралі ад іх дакументы і выдавалі часовае пасведчанне. Упаўнаважаныя праводзілі з імі гутаркі пра важнасць ліквідацыі непісьменнасці. Асобная камісія аб'яўляла дапрызыўнікам, за якімі школамі яны замацаваны. Адначасова з дапрызыўнікамі выклікаліся настаўнікі, якім перадаваліся спісы непісьменных, і яны тут жа знаёміліся са сваімі навучэнцамі. Настаўнікі штомесяц здавалі справаздачу валасному выканкаму, а павятовыя выканаўчыя камітэты і ўпаўнаважаныя Галоўпалітасветы падавалі звесткі пра ліквідацыю непісьменнасці ў Надзвычайную камісію [11, арк.75].

Што тычыцца ліквідацыі непісьменнасці сярод падлеткаў (рабочай моладзі), то яна здзяйснялася наступным чынам. Наркамасветы зацвердзіў такую колькасць навучэнцаў у іх: у Мазыры - 1 школа на 160 чалавек, Бабруйску - 2 школы на 160 чалавек, Барысаве - 2 школы на 120 чалавек, Ігумені - 2 школы на 30 чалавек, Слуцку - 1 школа на 160 чалавек, Мінску - 3 школы на 160 чалавек [11, арк.138]. У школы прымалі рабочых падлеткаў (юнакоў і дзяўчат) ва ўзросце ад 14 да 20 гадоў. Тэрмін навучання ў школах рабочай моладзі складаў тры гады - два асноўныя і адзін падрыхтоўчы для малапісьменных і непісьменных па семестравай сістэме.

З паляпшэннем эканамічнага і фінансавага становішча Беларусі

ажывілася работа па ліквідацыі непісьменнасці сярод працоўных. Колькасць асоб, якія авалодвалі граматай ў 1923/24 навучальным годзе, у параўнанні з папярэднім, узрасла больш чым на 4,5 тыс. чалавек і раўнялася амаль 8 тыс. У 1924/25 навучальным годзе іх колькасць павялічылася да 37,4 тыс. чалавек [12, с.42].

Для навучэнцаў на лікпунктах выдавалася спецыяльная літаратура: буквары, кнігі для чытання, плакаты, лозунгі і г.д. У 1925 г. быў выдадзены буквар для дарослых на беларускай мове. Выдаваліся кнігі для чытання пад такімі выразнымі назвамі, як “Наша сіла - ніва ды машына”, “Наша сіла - саюз”, “Наша праца” і інш. Для забеспячэння метадычнага кіраўніцтва ў шэрагу месц у 1924/25 навучальным годзе пачалі арганізоўвацца за дзяржаўны кошт так званыя апорныя (інструктарскія) лікпункты, у якіх настаўнікі - культармейцы з іншых лікпунктаў - маглі б засвойваць новыя метады навучання непісьменных і малапісьменных.

У 1926 г. канчаткова аформілася таварыства “Прэч непісьменнасць”, якое ўзначаліў старшыня ЦВК БССР А. Чарвякоў. Пачатак яго заснавання - 29 снежня 1923 г., калі на нарадзе прадстаўнікоў дзяржаўных, партыйных і прафсаюзных арганізацый было створана часовае бюро таварыства ў складзе 9 чалавек. Ім даручалася распрацаваць статут і намеціць планы на бліжэйшую перспектыву [11, арк.181]. У 1924 г. пачалі стварацца гурткі добраахвотнага таварыства, а 14 мая 1926 г. іх першы з’езд у Мінску канчаткова аформіў таварыства “Прэч непісьменнасць” і вызначыў задачу садзейнічаць найхутчэйшай ліквідацыі непісьменнасці сярод насельніцтва Савецкай Беларусі шляхам адкрыцця лікпунктаў і тлумачальнай работы сярод працоўных. У акруговых цэнтрах рэспублікі былі створаны аддзелы, а ў павятовых і валасных цэнтрах, на прамысловых прадпрыемствах і ва ўстановах - ячэйкі названага таварыства.

На жнівень 1926 г. у беларускім таварыстве “Прэч непісьменнасць” ужо налічвалася больш за 25 тыс. членаў [14, с.77]. Калі ў 1924 г.

лікпункты існавалі на дзяржаўныя сродкі ў асноўным пры агульнаадукацыйных школах, то з 1924 г. пачалі дзейнічаць гурткі і лікпункты па лініі таварыства "Прэч непісьменнасць", дзе культармейцамі працавалі пісьменныя партыйныя, савецкія, камсамольскія работнікі, служачыя савецкіх устаноў і студэнты, якія выконвалі даручэнні ў парадку грамадскай ініцыятывы. Нягледзячы на страшэнныя матэрыяльныя цяжкасці, колькасць лікпунктаў штогод павялічвалася. На 1 жніўня 1926 г. з 2 630 лікпунктаў, што меліся ў БССР, 913 працавалі па лініі таварыства "Прэч непісьменнасць"; з 72 757 чалавек навучэнцаў 18 877 навучаліся па лініі гэтага таварыства [15, арк.1]. Станоўчым з'яўляецца і тое, што ў гэтыя гады актыўна арганізоўваліся сельскія ячэйкі. Напрыклад, у 1926 г. са 150 ячэек, што меліся ў Мінскай акрузе, 48 знаходзіліся ў сельскай мясцовасці.

У складзе Савецкага Саюза, паводле даных 1926 г., БССР па пісьменнасці знаходзілася на 3-м месцы. Так, на Украіне на 1 000 чалавек насельніцтва прыходзілася 584 непісьменныя, у РСФСР - 603, а ў БССР - 673 чалавекі [11, арк.445]. А сярод 40 народаў СССР беларусы, паводле працэнта граматнасці на 100 чалавек кожнай народнасці, займалі 10-е месца (37,3%) пасля яўрэяў (72,3%), немцаў (60,2%), палякаў (53,8%), грэкаў (50,3%), рускіх (45,1%), карэлаў (41,4%), украінцаў (41,3%), грузінаў (39,5%), зыранаў (38,0%). Непісьменнасць сярод жанчын-сялянак складала 78% [16, с.13].

У рабоце сярод жанчын асаблівая ўвага звярталася на ліквідацыю непісьменнасці жанчын - грамадскіх работніц, жанчын-дэлегатак. Напрыклад, паводле матэрыялаў абследавання ЦСУ, на 1 снежня 1926 г. лікпункты ахоплівалі 52,6% мужчын, 47,4% жанчын [17, арк.77]. У навучанні грамаце было задзейнічана галоўным чынам гарадское насельніцтва рэспублікі. Гэтаму спрыяла і лепшая арганізацыя рабочых, аб'яднаных у прафесійныя саюзы, і наяўнасць вялікай колькасці пісьменных, якія прыцягваліся да навучання непісьменных. Колькасць

навучэнцаў у вёсцы ў параўнанні з горадам была нязначная. І менавіта таму, што цяжка было арганізоўваць аднаасобнае беларускае сялянства, па прычыне таго, што мела месца хутарызацыя, адсутнічалі культурныя сілы у вёсцы, за выключэннем настаўніцтва. Матэрыяльныя цяжкасці насельніцтва надзвычай ўскладнялі ліквідацыю непісьменнасці бяднейшых слаёў вёскі. Напрыклад, з 7 800 асоб, якія вучыліся на лікпунктах у 1923/24 навучальным годзе, толькі 3 500 чалавек былі жыхарамі вёскі. Яшчэ менш сялян вучылася ў наступным навучальным годзе: 5 700 чалавек з 37 400, што займаліся на лікпунктах краіны [12, с.42]

Паводле даных акруговых інспекцый народнай асветы, праца за 1926/27 і 1927/28 навучальныя гады зніжалася [18, арк.288]. Колькасць тых, хто скончыў лікпункты, складала толькі 60% ад агульнай колькасці навучэнцаў у лікпунктах. Зразумела, што не хапала сродкаў, але не толькі гэтым тлумачацца недахопы. Не былі распрацаваны дзейсныя арганізацыйныя формы, не мелася сістэматычнага метадычнага кіраўніцтва, не было сваіх кадраў працаўнікоў па ліквідацыі непісьменнасці. Асноўнае ядро ў гэтай справе складалі настаўнікі, а значная колькасць асоб, якія ажыццяўлялі індывідуальнае і групавое навучанне, з’яўляліся не настаўнікамі, а камсамольцамі, служачымі ўстаноў, дэмабілізаванымі чырвонаармейцамі і інш. Сістэматычная праца ў галіне методыкі навучання сярод іх не вялася, акрамя выпадковых сходаў па агульных пытаннях ліквідацыі непісьменнасці. З 1927 г. Наркамасветы распачаў перападрыхтоўку кадраў шляхам канферэнцый, сходаў, гуртковых заняткаў, інструктажу работнікаў раённай сеткі, лікпунктаў і школ малапісьменных. У 1927 г. у Мінску пачалі працаваць Усебеларускія курсы перападрыхтоўкі ліквідатараў непісьменнасці і малапісьменнасці [19, с. 170-171].

Аднак нягледзячы на адсутнасць метадычнага забеспячэння да канца 1927 г. склалася сістэма асветы для дарослых і падлеткаў. Першай

ступенню ў гэтай сістэме сталі школы ці пункты па ліквідацыі непісьменнасці (лікпункты), непасрэдным працягам якіх з'яўляліся аднагадовыя школы для малапісьменных дарослых і пераросткаў. На базе школ для малапісьменных будаваліся двухгадовыя вячэрнія рабочыя і сялянскія школы, а таксама вячэрнія школы павышанага тыпу з пяцігадовым навучаннем. Яны і былі апошняй ступенню ў сістэме асветы дарослых і мелі на мэце даць агульную сярэднюю адукацыю, узняць грамадскую свядомасць і палітычную падрыхтоўку, садзейнічаць павышэнню вытворчай кваліфікацыі слухачоў і даць ім веды, патрэбныя для паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы [17, арк.91].

У кастрычніку 1928 г. прайшоў II Усебеларускі з'езд таварыства "Прэч непісьменнасць", які адбыўся пры ўдзеле насельніцва г. Мінска і высокай актыўнасці партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый. Ён вызначыў недахопы ў працы па ліквідацыі непісьменнасці і прыняў перспектыўны план да канца 1935 г. З'езд надаў вялікае значэнне дзейнасці нізавых ячэек, таму што галоўная праца павінна быць на прадпрыемстве і ў вёсцы, там, дзе знаходзіцца нізавая ячэйка. Першачарговай задачай з'езд паставіў ліквідацыю непісьменнасці і малапісьменнасці сярод той часткі насельніцтва, удзел якой у агульнай справе сацыялістычнага будаўніцтва надзвычай неабходны і каштоўны [20, с.5]. У сваёй прамове на з'ездзе старшыня ЦВК БССР А. Чарвякоў падкрэсліў, што застаецца вельмі вялікі ўчастак фронту работы па ліквідацыі непісьменнасці, які не ахоплены дзяржаўнымі мерапрыемствамі, і што запаўненне гэтага прарыву на такім адказным фронце ўскладаецца на арганізаваную грамадскую дзейнасць, на таварыства "Прэч непісьменнасць", якое павінна ўзгадніць сваю работу з огранамі Наркамасветы [21, арк.97, 100].

У жніўні 1928 г. ЦК УЛКСМ прыняў пастанову "О проведении всесоюзного культурного похода молодежи", адной з асноўных задач якога

была барацьба з непісьменнасцю і бескультур'ем. Тысячы людзей добраахвотна ўключыліся ў працу. Камсамол Беларусі ў 1929 г. правёў масавы культпаход па ліквідацыі непісьменнасці. Мінская акружная камсамольская арганізацыя стварыла 551 лікпункт, дзе вучылася 13 тыс. чалавек, і 16 школ малапісьменных, у якіх мелася 600 навучэнцаў [22, с.178]. Кожны пісьменны камсамолец павінен быў навучыць аднаго непісьменнага, а разам - ліквідаваць непісьменнасць у сваім асяроддзі. У камсамольскі білет кожнага члена УЛКСМ укладваўся спецыяльны лісток, у якім рабілася адзнака пра колькасць навучаных ім чалавек.

Адкрыццю новых пунктаў па ліквідацыі непісьменнасці і павелічэнню ў іх колькасці навучэнцаў садзейнічалі месячнікі "За пісьменнасць", якія праводзіліся на пачатку навучальнага года. У час месячніка 1928 г. праводзіўся збор грашовых сродкаў праз газеты, латарэю, скарбонкавыя накапленні, падпісныя лісты, а таксама за кошт працэнтных надбавак на цану піва, гарэлкі, віна, на білеты ў тэатр і кіно [23, арк.459]. Наркамасветы і Беларускае дзяржаўнае выдавецтва старанна рыхтаваліся да месячніка і накіроўвалі на месцы падручнікі і дапаможнікі па ліквідацыі непісьменнасці. Рэдакцыі цэнтральных і акруговых газет выпускалі спецыяльна прысвечаныя месячніку нумары і на працягу кампаніі шырока паказвалі працу таварыства "Прэч непісьменнасць".

Наркамасветы і таварыства "Прэч непісьменнасць" з 1 сакавіка 1928 г. пачалі праводзіць конкурс на лепшы лікпункт, ліквідатара непісьменнасці і ячэйку таварыства "Прэч непісьменнасць". Задачамі конкурсу з'яўляліся выяўленне новых форм і метадаў барацьбы з рэцыдывам непісьменнасці, замацаванне навыкаў і ведаў, набытых навучэнцамі на лікпунктах, вывучэнне становішча ў справе ліквідацыі непісьменнасці, малапісьменнасці і працы ячэек таварыства "Прэч непісьменнасць" у вёсках рэспублікі [17, арк.256]. Да ўдзелу ў конкурсе прыцягваліся работнікі па ліквідацыі непісьменнасці органаў

Наркамасветы, прафесійных і грамадскіх арганізацый, актыў і асобныя прыхільнікі таварыства “Прэч непісьменнасць”, ліквідатары, настаўнікі, селькоры, працаўнікі хат- чытальняў, актывісты сельскіх Саветаў, якія скончылі лікпункты і школы малапісьменных, усе працаўнікі культурных устаноў вёсак.

Матэрыялы і вынікі конкурсу публікаваліся ў газетах “Беларуская вёска”, “Чырвоная змена” і ў акруговых газетах. Безумоўна, дадзены конкурс адыграў станоўчую ролю ў арганізацыі работы па ліквідацыі непісьменнасці. Гэта быў важны крок у фарміраванні грамадскай думкі вакол азначанага пытання, яшчэ адна прапрацоўка яго ў раённых органах НКА, сельсаветах і на сельскіх сходах, у ячэйках таварыства “Прэч непісьменнасць”, грамадскіх арганізацыях.

Улічваючы тое, што эфектыўнасць працы па ліквідацыі непісьменнасці за папярэднія навучальныя гады знізілася, ЦК КП(б)Б у лютым 1929 г. на XII з’ездзе КП(б)Б, затым у маі гэтага года на пасяджэнні Сакратарыята ЦК КП(б)Б паставіў у якасці асноўнай задачы скараціць колькасць непісьменных з 725 тыс. да 177 тыс. чалавек [24, с. 115], дабіцца рашучага пералому ў далейшай дзейнасці па ліквідацыі непісьменнасці.

Настаўнікамі праводзілася шырокая тлумачальная кампанія сярод рабочых, калгаснікаў і бядняцка-сялянскіх колаў на масавых сходах, а ў гарадах на спецыяльных канферэнцыях. Дадзенае пытанне было абмеркавана ва ўсіх грамадскіх і прафсаюзных арганізацыях, у гарадах дадаткова праведзены ўлік непісьменных. У Мінску, Віцебску, Гомелі праз гарсаветы праведзены абавязковыя пастановы аб выдзяленні памяшканняў для работы лікпунктаў, навучэнцам вызначана некаторая перавага на атрыманне прадуктаў без чаргі і г.д. Ва ўсіх раёнах (за выключэннем 10 - 15) праведзены раённыя двухтыднёвыя курсы па падрыхтоўцы ліквідатараў і актыву “Прэч непісьменнасць”. У сярэднім кожныя курсы выпусцілі ад 20 да 30 чалавек [25, арк.298].

Значна пашырылася сетка ячэек таварыства “Прэч непісьменнасць”, узрасла колькасць яго членаў, ажывілася праца. У некаторых гарадах і раёнах былі праведзены перавыбары бюро ячэек таварыства. Назіралася рэзкае паскарэнне тэмпаў ліквідацыі непісьменнасці. За 1929/30 навучальны год было ахоплена 270400 чалавек (з іх 234 700 - у сельскай мясцовасці), за 1930/31 - 297 600 чалавек (з іх 277 800 - у сельскай мясцовасці) [12, с.42].

У адпаведнасці з павелічэннем тэмпаў работы па ліквідацыі непісьменнасці мелася некаторае павелічэнне грашовых выдаткаў, якія ў 1929/30 навучальным годзе складалі 1 082 000 рублёў супраць 344 688 рублёў у 1928/29 н.г. [25, арк.289]і 289 859 рублёў у 1927/28 навучальным годзе [26, арк.311]. Аднак сродкі, адведзеныя на ліквідацыю непісьменнасці і малапісьменнасці, не забяспечвалі разгортванне сеткі, нават дапускалася іх трата не па прамым прызначэнні. З боку Наркамасветы БССР і яго органаў на месцах не прымаліся канкрэтныя меры, каб ліквідаваць гэтыя з’явы. Было вядома, што кошт навучання аднаго непісьменнага складаў 6 рублёў 12 капеек, і толькі на ліквідацыю непісьменнасці 280 490 чалавек патрэбна была агульная сума у 1 716 598 рублёў [25, арк.289]. Аднак выявілася, што на ліквідацыю непісьменнасці і малапісьменнасці адпускалася толькі 10—18 капеек на непісьменнага ў год. Але і гэтыя сродкі не выкарыстоўваліся поўнасцю: у 1925/26 навучальным годзе не выкарыстана 15 тыс. рублёў, у 1926/27 - 50 тыс. рублёў, не ўсе сродкі выкарыстаны і ў 1927/28 навучальным годзе [27, с.1-3]. На 1929/30 навучальны год было вызначана за кошт Наркамасветы ліквідаваць непісьменнасць 188 168 чалавек, за кошт таварыства “Прэч непісьменнасць” - 32 000, прафсаюзаў і кааперацый - 60 322 чалавек [18, арк.289].

Улічваючы ўсё гэта, Сакратарыят ЦК КП(б)Б на пасяджэннях 20 студзеня і 1 лютага 1930 г. разгледзеў пытанне “Аб стане працы па

ліквідацыі непісьменнасці ў БССР" і пастанавіў забараніць выкарыстанне сродкаў, якія адпускаліся ЦВК для ліквідацыі непісьменнасці, на іншыя патрэбы [27, арк.550]. Больш таго, усе распарадчыкі крэдытамі прыцягваліся да судовай адказнасці за выкарыстанне іх на іншыя мэты альбо няпоўнае выкарыстанне гэтых сродкаў наогул [29, арк.331]. Фракцыям Белкаапсаюза, Белжылсаюза, Белкустпрамсаюза і Белсельсаюза належала адлічваць 20% культфондаў на патрэбы ліквідацыі непісьменнасці, перадаўшы гэтыя сродкі арганізацыям, якія практычна праводзілі гэтую працу [29, арк.286]. ЦК КП(б)Б паставіў са ўсёй катэгарычнасцю перад партыйнымі, савецкімі, прафсаюзнымі і грамадскімі арганізацыямі задачу павысіць палітычны і культурны ўзровень мас рабочых, батракоў, калгаснікаў і бедняцка-серадняцкага сялянства, і, у першую чаргу, як неадкладную задачу - ліквідацыю непісьменнасці сярод працоўнага насельніцтва. Патрабавалася за тры гады ліквідаваць непісьменнасць 861 273 чалавек ва ўзросце 36 і больш гадоў [18, арк.288].

Для ўзмацнення кіруючых кадраў народнай асветы на працягу двух тыдняў было вылучана 50 камуністаў у якасці раённых інспектараў і 15 — на акруговую інспектарскую працу. З 1930 г. Наркамасветы праводзіў перападрыхтоўку раённых інспектараў праз 1,5-2-месячныя курсы. Шэраг устаноў перадаваўся пад непасрэднае кіраўніцтва акругам, уводзіліся ў штат пасады інспектараў прафасветы, лікбеза, дзіцячых устаноў [18, арк.295].

Паводле рашэння Сакратарыята ЦК КП(б)Б, у вучэбныя планы і праграмы педтэхнікумаў і курсаў па падрыхтоўцы настаўнікаў ужо з 1928/29 навучальнага года ўводзіўся курс методыкі ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці сярод дарослых і пераросткаў [29, арк.331]. У пастанове Сакратарыята № 40 ад 1 лютага 1930 г. было вызначана Наркамасветы, таварыству "Прэч непісьменнасць", Беларускаму дзяржаўнаму выдавецтву зрабіць усе захады на забеспячэнне навучэнцаў

падручнікамі і дапаможнікамі, асабліва сшыткамі, а затым прыступіць да падрыхтоўкі, складання і перапрацоўкі праграм, падручнікаў і дапаможнікаў да будучага навучальнага года. Наркамасветы, ЦСПСБ, ЦС таварыства “Прэч непісьменнасць” і ЦК ЛКСМБ за летні перыяд 1930 г. неабходна было арганізаваць шэраг раённых і акруговых кароткатэрміновых курсаў па падрыхтоўцы кадраў ліквідатараў непісьменнасці ў колькасці, якая забяспечыла б поўнае выкананне плана ліквідацыі непісьменнасці [28, арк.549-550].

У чэрвені 1930 г. ЦВК і СНК БССР прынялі пастанову аб абавязковасці навучання, паводле якой усе непісьменныя ва ўзросце ад 12 да 45 гадоў (як у вёсцы, так і ў горадзе), не пазбаўленыя выбарчых правоў, павінны былі зарэгістравацца да 1 жніўня 1930 г. у месцах пражывання і ліквідаваць сваю непісьменнасць у наступныя тэрміны: а) рабочыя і члены прафсаюзаў - на працягу 1930 г.; б) сельскагаспадарчыя рабочыя, батракі, дапрызыўнікі 1909-1910 гг. - да 1 мая 1931 г.; в) астатняе працоўнае насельніцтва і, у першую чаргу калгаснікі - на працягу 1931-1932 гг. У парадку грамадскай работы па ліквідацыі непісьменнасці асобы, якія мелі веды ў аб’ёме не меншым за сямігадовую школу, абавязваліся на працягу 1930-1932 гг. навучыць пісьменнасці аднаго непісьменнага ці выканаць іншую працу ў гэтай галіне. Асобы, якія ўхіляліся ад рэгістрацыі, або ад ліквідацыі сваёй непісьменнасці, прыцягваліся да адказнасці і нават накладання штрафаў да 15 рублёў, а хто зрываў гэту работу - штрафаваліся ў памеры ад 5 да 25 рублёў, ці прыцягваліся да прымусовай працы тэрмінам да аднаго месяца [30, арк. 80-81].

На першы погляд - вельмі жорсткі падыход у вырашэнні пытання ліквідацыі непісьменнасці, але ён дыктаваўся часам. Паскораныя тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва і задачы сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі патрабавалі адпаведнасці працы па ліквідацыі непісьменнасці запатрабаванням рэканструкцыйнага перыяду. Менавіта

таму гэты працэс набыў да канца 1920-х гадоў масавы характар. У рабоце па ліквідацыі непісьменнасці рашаючую ролю адыгралі настаўнікі, пісьменныя працаўнікі фабрык, заводаў, саўгасаў, калгасаў, арганізацый і ўстаноў, грамадскія плыні, школьнікі, студэнты.

У выніку плённай працы, здзейсненай ў галіне народнай асветы і ліквідацыі непісьменнасці дарослых і падлеткаў у 1921-1930 гг., значна ўзрасла пісьменнасць насельніцтва рэспублікі. Паводле дадзеных перапісу 1926 г., пісьменнымі з'яўляліся 53,3% насельніцтва, паводле падліку да канца 1929 г. - 63,0%, да канца 1930 г. - 69,0%; павелічэнне паказчыка за кампанію па ліквідацыі непісьменнасці трох папярэдніх гадоў (1927-1929 гг.) - 9,7%, аднаго 1929/30 навучальнага года - 6,0% [31, с.14].

Настаўніцтва Беларусі з'явілася вядучай сілай у ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці дарослага насельніцтва. Сістэма асветы для дарослых і падлеткаў уключала школы і пункты па ліквідацыі непісьменнасці (лікпункты), аднагадовыя школы для малапісьменных дарослых і пераросткаў, двухгадовыя вячэрнія рабочыя і сялянскія школы, якія давалі веды ў аб'ёме пачатковай школы, і пяцігадовыя вячэрнія школы павышанага тыпу. Апошнія давалі агульную сярэднюю адукацыю, садзейнічалі павышэнню ідэйна-палітычнага ўзроўню і вытворчай кваліфікацыі слухачоў, давалі веды, патрэбныя ім для паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.

**Літаратура:**

1. НА РБ, ф.42, воп.1, спр.1075.

2. НА РБ, ф.42, воп.1, спр.1807, ч.2.

3. Гісторыя Беларусі: Вучэб. дапам. для ВНУ: У 2 -х ч. / Пад. рэд.: Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля.-Ч.2,—Мінск: Універсітэцкае, 1998,-люты 1917-1997 гт,—463с.

4. Лысов С. Вопросы ликвидации безграмотности // Савецкае будаўніцтва.- 1924.-№1.-С.96-100.

5. НА РБ, ф.42, воп.1, спр.1104.

6. НА РБ, ф.42, воп.1, спр.65.

7. Белорусский отдел // Вестник Народного Комиссариата Просвещения,- 1921.-№1.-С.43-14.

8. НА РБ, ф.42, воп.1, спр.91.

9. Ликвидация безграмотности в Советской Белоруссии // Школа и культура Советской Белоруссии.—1921.—№1—2,—С.27—29,118—120.

10. В Народном Комиссариате Просвещения. Работа отдела школ взрослых и по ликвидации безграмотности за 1922 г. // Вестник Народного Комиссариата Просвещения 1922.—Вып.7—8.—С.52.

11. НА РБ, ф.42, воп.1, спр.1102.

12. Культурное строительство БССР. Издание УМХУ БССР. Минск. 1940—109с.

13. Сабалеўскі. Настаўніцтва і таварыства “Прэч непісьменнасць” // Асвета.- 1928.-№2.-С. 17-20.

14. Фірсава Е.І. Да пытання ліквідацыі непісьменнасці насельніцтва Беларусі ў аднаўленчым перыядзе (1921-1925 гг.) / Весці АН БССР.-Серыя грамад. наву к.—1965. —№3. —С.72—80.

15. НА РБ, ф.42, воп.1, спр.1116.

16. Гнеўка М. Завяршэнне ліквідацыі непісьменнасці дарослага насельніцтва // Народная асвета, 1967.-№9.-С. 13-18.

17 НА РБ, ф.42, воп.1, спр. 1807, ч.1.

18. НА РБ, ф.4, воп.8, спр.17, ч.1.

19. Хвасцюк. Задачы знішчэння непісьменнасці // Асвета.—1927.—№5—6.— С. 169-171.

20. Другі Усебеларускі З'езд таварыства “Прэч непісьменнасць”.- Менск: Выд. ЦС т-ва. Прэч непісьменнасць, друк. Менскпраўдому.-1928.-

21 с.

21. План ліквідацыі непісьменнасці падлеткаў і дарослых у Беларускай ССР. (Паяснялъная запіска) // Асвета.—1928.—№5.—С.3—31.

22. Комсомол — нашей доблестной партии сын. Из истории Ленинского Коммунистического Союза Молодёжи Белоруссии. (Сб. очерков. Ред. А.К. Зинин, А.А. Маркевнч).—Минск: Госиздат БССР, ред. соц-эк. лит,—1960.—492с.

23. НА РБ, ф.4, воп.8, спр.13, ч.2.

24. Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК: В 2-х т.-Т.1.-Минск: Беларусь, 1983-1984. (1918-1927 гг.)-1983.-527 с.; Т. 2 (1928-1932 гг.).-1984.-511 с.

25. НА РБ, ф.4, воп.8, спр.7, ч.1.

26. НА РБ, ф.42, воп.1, спр.1823, ч.3.

27. Камуністычная Партыя Беларусі. Цэнтральная Кантрольная Камісія. Дзейнасць Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі КП(б)Б. Да справаздачы на XII-ым з’ездзе КП(б)Б (люты 1929 г.). Менск, выд. ЦК КП(б)Б, друк. БДВ.1929-22с.

28. НА РБ, ф.4, воп.8, спр.17, ч.2.

29. НА РБ, ф.4, воп.8, спр.11, ч.1.

30. НА РБ, ф.4, воп.3, спр.38, ч.1.

31. Всеобощее обучение, ликвидация неграмотности и подготовка кадров. М.: Планхозгаз,—1930.—11 с.